Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana gotówką

№ 26 | Вільня, Аўторак 9 Верасьня 1930 г. | Год VI (XIV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

АДОЗВА
Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні
да Беларускіх Нацыянальных Арганізацыяў і ўсяго Беларускага Народу.

БЕЛАРУСЫ!

30-га жніўня с. г. Прэзыдэнт Польскай Рэспублікі распусьціў Сойм і Сэнат і вызначыў выбары ў новы Сойм на дзень 16-га лістапада, а ў Сэнат на дзень 23-га лістапада 1930 г.

Ад 1922 году Беларускі Народ пад Польшчай на аснове выбарнага закону пасылаў у польскі парлямэнт прадстаўнікоў бараніць там сваіх нацыянальных, соцыяльных і рэлігійных правоў. У наступны Сойм і Сэнат Народ Беларускі павінен так-жа пасланць сваіх паслоў.

Каб бараніць правы Беларускага Народу, трэба йсьці на выбары і пасланць у польскі парлямэнт як найбольш сваіх прадстаўнікоў.

Дзеля гэтага Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні заклікае ўсе беларускія нацыянальныя арганізацыі і ўвесь Беларускі Народ не разьбіваць сваіх сіл, а аб'яднаць усе гэтыя сілы, каб пайсьці на выбары адзіным усебеларускім фронтам.

З гэтай мэтай Беларускі Нацыянальны Камітэт на сваім Агульным Сходзе 7-га верасьня 1930 году зарганізаваў Часовую Агульна-Беларускую Выбарную Камісію, якой і даручыў склікаць зьезд беларускіх народных арганізацыяў і паасобных беларускіх народных дзеячоў дзеля стварэньня Адзінага Беларускага Выбарнага Камітэту.

Адрас Камісіі: Вільня, Людвісарская вул. № 1 кв. 19.

Беларускі Нацыянальны Камітэт.

Вільня, 7-га жніўня 1930 году.

Развал у Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі і яе шкодніцкая праца на нашых землях.

Нікому ня ёсьць сакрэтам, што Комінтэрн мае асобны аддзел сваей камуністычнай партыі ў нашым краю, які носіць назоў Комуністычнай Партыі Заходняй Беларусі ці ў скарочаньні К.П.З.Б. Гэты аддзел комуністычнай партыі ня ёсьць самастойнай партыяй на нашых землях, якая-б магла выбіраць з паміж сябе людзей на кіраўнічыя становішчы і кіравацца пастановамі сваіх сяброў. Не, гэты аддзел, ці як яго камуністы назвалі К.П.З.Б. цалком залежны ад Комінтэрну і мусіць выконываць загады накінутыя згары. Мала таго, што К.П.З.Б. мусіць толькі выконываць загады Комінтэрну, не ўваходзячы ў крытыку гэтых загадаў, але К.П.З.Б. аддана пад надзор і кіраўніцтва комуністычнай партыі ў Польшчы. Кожны сябра К.П.З.Б. гэта найміт Комінтэрну, які мусіць рабіць тое, што прыкажа згары начальства. Начальства-ж гэтае, маючы на мэце сусьветную пралетарскую рэвалюцыю, прыказвае сваім наймітам дэзорганізаваць масы, „узрываць" усялякія культурна-прасьветныя, палітычныя, грамадзкія гаспадарча-коопэратыўныя і іншыя арганізацыі. А гэта дзеля таго, каб не дапусьціць працоўныя масы да матэр'яльнага дабрабыту і прасьветы. Словам, Комінтэрн, хочаты падгатаваць грунт да пралетарскай рэвалюцыі, трымаючы правіла: „чем хуже, тем лутше" — стараецца адцягнуць масы праз дэмагогічную агітацыю сваіх наймітаў ад таго шляху, на якім гэтыя масы могуць дайсьці да лепшага заўтра.

Цяпер вось заўважваецца нейкая новая тактыка ў дзейнасьці наймітаў Комінтэрну, якія належаць да брыгады аддзелу К.П.З.Б. Дзейнасьць-жа гэтая выглядае на тое, што гэты ваюючы аддзел пачынае адступаць ці лепш сказаць адыходзіць з нашай вёскі ў больш згушчаныя масы места.

Прычынай адыходу „змагароў" за пролетарызацыю беларускіх сялянскіх масаў з вёскі зьяўляецца ўзрост сярод народных масаў нацыянальнай сьведамасьці і зразуменьне ад'емных старон гаспадарчага ладу ў С.С.Р.Р. А з прычыны гэтай пачалі моцна радзець і рады аддзелу — К.П.З.Б. на нашым сяле.

Кіраўнікі, хочачы ўтрымаць сваю пляцоўку ў нашым краю, пачалі ўцягаваць да працы ў К.П.З.Б. каго папала. Прыймаючы на такую працу людзей проста з вуліцы, рэч зразумелая, набралі мноства правакатараў і падонкаў грамадзянства, якія ніколі ніякай ідэі ня мелі і мець ня могуць дзеля свайго ўпадку маральнага, а йдуць на нелегальную падпольную камуністычную працу толькі таму, што за гэта плацяць ім грошы. У выніку гэтага — пагалоўныя арышты гэтых наймітаў, якія адзін другога выдаюць.

Ня ёсьць так-жа сакрэтам, што камуністы стараліся сваіх людзей прапіхаць у рожныя арганізацыі легальныя або перакупляць ня чэсных сяброў тых арганізацыяў, каб такім чынам рабіць там сваю работу: сьпярша падважываць мараль сярод сяброў тых арганізацыяў і раскладываць іх унутры Калі-ж ім гэта не ўдавалася, яны такую арганізацыю „ўзрывалі".

Як заўважываецца, дык камуністам на беларускай вёсцы праца не ўдаецца, бо пайшлі яны на „ўзрыў" па ўсім фронце.

Раскідываньне ў вялікай колькасьці, па зьместу дурной, літэратуры ў публічных мяйсцох — па дарогах, укладываньне ў легальныя, добрага і здаровага зьместу, кніжкі друкаў камуністычнай прапаганды, падшываньне пад аўтарытэты ў народзе, выкарыстоўваючы іх імя фальшыва выдаючы з выдрукаваным іх прозьвішчам, як выдаўца брашуры, (як гэта зроблена з кс. А. Станкевічам) і ў рэшце надпісываньне на брашурах камуністычнага зьместу аб колектывізацыі загалоўкаў „Аб узгадаваньні дзяцей" — сьведчыць аб тым, што беларускае сялянства ёсьць элемэнтам адпорным для камуністычнай ідэолёгіі.

Бачачы гэта, камуністы пайшлі на эфэкт вонкавы, загадываючы сваім наймітам „узрываць", дзе змогуць, легальныя арганізацыі і выступаць правакацыйна прад паліцэйскімі ўладамі, каб гэткім спосабам навясьці тэрор з боку паліцыі ў адносінах да нічым нявінаватай люднасьці і легальных арганізацыяў.

Гэты эфэкт камуністычнай дзейнасьці— гэта ні што іншае, як сьмяротная агонія. Але і ўміраючы зьвер у конвульсыйным дрыганьні нагамі можа зраніць чалавека. Дык аб гэтым трэба помніць і належна высьцерагацца.

Я. Д.

З газэт

„Бялорусіні."

Пад такім загалоўкам „Kur. Wileński" № 196 зьмяшчае цэлы рад стацеяк пана Т. Г. агляду беларускай справы, друкаваных сьпярша ў Варшаўскай газэце „Gazeta Polska". Пан Т. Г. у сваіх стацейках аб беларусах, якія можна назваць студыямі падшуканьня ключа да беларускай душы з боку польскага, а думаючы, што гэты ключ ужо ён і знайшоў, падае сваё „адкрыцьцё" да ведама адпаведных дзейнікаў вучачы, як гэтым ключам адчыніць насьцеж беларускую душу для доступу туды польскай культуры. Гэты санацыйны польскі знахар беларускасьці, падае такі рацэпт, паводле якога народ Беларускі можа сабе і быць народам, але без беларускай народнай душы і канешне з польскай культурай. Словам, пан Т. Г. радзіць, як устаўляць Беларускаму народу ды польскую душу, а ўставіўшы польскую душу ў арганізм беларускі, вонкавы выглед беларуса сам зьменіцца і будзе зусім падобен да польскага.

Аб тым, што мэта ў ва ўсіх польскіх групаў адносна беларусаў адна, мы ўжо ня раз пісалі. Цяпер запытаем толькі ў стаўпоў беларускай санацыі, як яны разумеюць сваю працу для дабра Беларускага народу?

Пане Луцкевіч і Янка Станкевіч! Як можна інакш разумець Вашую дзейнасьць, калі ня так, як мы яе акрэсьлілі — шкоднай, бо вы-ж пайшлі па лініі пана Т. Г.!

Беларусы, сьцеражэцеся „Стронніцтва Хлопскага!“

Польская партыя, якая носіць назоў „Стронніцтва хлопскага“ і якая ад нейкага часу так нахальна лезе на нашы землі, каб замуціць ваду і ў гэтай вадзе налавіць для сябе мандатаў, цяпер ужо ўсім знаная. На апошніх выбарах у Лідзкім і Сьвянцянскім вокругах ніхто так моцна ня крычаў, як агітатары „Стронніцтва Хлопскага“, ніхто так не расьпінаўся за народ, як яны, ніхто столькі не абяцаў, як крыкуны і дэмагогі з гэтага „Стронніцтва“. І праўду кажучы — народ ім мяйсцамі паверыў, доказам чаго ёсьць 4 мандаты з Лідзкага вокругу і 3 з Сьвянцянскага.

Мы ўжо раз пісалі, якімі нягоднымі спосабамі здабылі польскія „хлопы“ для сябе мандаты і як ашукалі наш народ. „Хлопы“ не перабіралі ў спосабах агітацыі і ўсялякімі цёмнымі штучкамі стараліся перацягнуць беларускіх сялян на свой бок.

Агітатары „Строн.Хлоп.“ стараліся ўсюды крычаць, што яны беларусы і што партыя іх чыста беларуская. Іхныя кандыдаты ў паслы: Дубровнік, Матэцкі, Адамовіч. Шапель і інш. прамаўлялі да народу па беларуску, клянучыся, што яны за беларускі народ, што яны будуць дамагацца беларускай школы, беларускага самаўраду, нават часам заяўлялі, што яны проціў асадніцтва і стаяць за незалежнасьць Беларускага народу... Прахадзімцы і палітычныя бадзякі, пытаемся вас, ці вы шчыра аб гэтым гаварылі? Калі вы шчыра гаварылі, то няўжо вы ня ведаеце, што гаворыць аб Беларускім народзе ваша начальства; што зрабіў у Рызе ў 1922 г. з Беларускім народам ваш павадыр Домбскі? А чаго дамагаўся ў Сойме другі ваш павадыр Плюта? Ці вы ня ведаеце, што Домбскі разрэзаў жывы Беларускі народ на 2 часьці, адну часьць аддаў бальшавікам, а другую ўзяў пад Польшч? Ці вы ня ведаеце, што віцэ-старшыня „Стр. Хлопскага“ пан Плюта яшчэ нядаўна праводзіў у Сойме новы асадніцкі закон, паводле якога маніцца наслаць на нашыя землі новыя хмары асаднікаў? Няўжо вы аб гэтым ня ведаеце, а калі ведаеце, то на што вы ашуквалі наш народ? Вы-ж з гэтага народу, вы ня прыезныя з польскага краю і вы адважыліся ашукаць свой народ. Дык вы здраднікі свайго народу.

Народзе, ведай аб тым, што тыя паслы з „Строн. Хлопскага“, якіх ты выбраў, яны цябе ашукалі і ня толькі ашукалі, але і здрадзілі! Яны пайшлі ў найгоршую для нас партыю, якая нясе нам новае асадніцтва і новую няволю.

Народзе, ведай, што „Стр. Хлоп“ — гэта асадніцкая партыя, якая пры помачы ашуканства хоча ачмуціць нас, так як даўней чмуціла нас „Вызваленьне“, хоча нашымі беларускімі галасамі даць нам новую партыю асаднікаў!

Дык сяляне-беларусы, сьцеражэцеся гэтай партыі, як заразы, ганіце вон ад сябе ашуканцаў беларускага народу!

Селянін з пад Ліды.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Вучыцельская сэмінарыя імені Фр. Багушэвіча ў Вільні. З пачаткам 1930-31 школьнага году польскія школьныя ўлады адчынілі ў Вільні вучыцельскую дзяржаўную коэдукацыйную сэмінарыю імені Фр. Багушэвіча. Сэмінарыя гэта мела быць беларускай, але пакульшто яна ёсьць такой толькі на паперы. Якая яна будзе ў будучыне — убачым.

Тры забароны. На дзень 17 жніўня с. г. гурткі Белар. Інст. Гасп. і Культуры у Жодзішках, Вялейскага пав. і ў Сьвірыдавічах Ашмянскага пав. ладзілі навуковыя лекцыі, якія меў прачытаць старш. Цэнтр. Ураду Інстытуту кс. В. Гадлеўскі. Але яшчэ прад 17 жніўня віленскі арцыб. Ялбжыкоўскі забараніў кс. Гадлеўскаму і паказацца ў Жодзішкі. Посьле гэтай забароны паехаў ў Жодзішкі чытаць лекцыю кс. А. Станкевіч, а кс. Гадлеўскі ў Сьвірыдавічы, але ім чытаць лекцыі забараніла ўлада адміністрацыйная.

У Жодзішках у той-жа дзень адбыліся ўрачыстыя дажынкі, ладжаныя тамашнім гуртком Інстытуту. Урачысты вечар дажынкаў адбыўся на берагу Вяльлі, дзе пры асьвятленьні берагу ракі агнямі моладзь і старэйшыя ў часе пачастунку дэклемавалі прыгожыя беларускія вершы, а песьня беларуская сваім рэхам разносілася ўшыр ваколіц. Гэты традыцыйны вечар не абыйшоўся і без „апекі“ паліцыі, якая ня спускаючы з свайго вока прысутнага там кс. Станкевіча, зорка сачыла з закустоў і ўвесь прабег вечарыны. Але ані „апека“ паліцыі, ані „місыйная“ дзейнасьць кс. Дроніча беларусказьці ў Жодзішках спыніць ня могуць. Сьведамасьць нацыянальная тамашніх жыхароў перамагае ўсе іх высілкі і беларуская культура штораз то шырэй ахоплівае беларускія масы.

Лекцыя кс. В. Гадлеўскага. Дня 24 жніўня с. г. кс. В. Гадлеўскі прачытаў навуковую лекцыю ў гуртку Бел. Інст. Гасп. і Культуры ў вёсцы Кірдзеўчы Віл.-Троцкага пав. на тэму „Пачаткі беларускага народу“. Не зважаючы на агітацыю камуністычных падшыванцаў, каб сяляне ня йшлі слухаць лекцыі, людзей на лекцыю сабралася поўна і не зьвяртаючы на недарэчныя выкрыкі камуністычнага найміта-балтуна, прысутныя слухалі лекцыі з зацікаўленьнем

Ліквідацыя гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культуры у Сьвірыдавічах Ашмянскага пав. Па загаду Віленскага ваяводы з дня 8.VIII с. г. гурток Інстытуту ў Сьвірыдавічах закрыты.

„Цэнтральны саюз Беларускіх Культурна-Прасьветных арганізацыяў“. У месяцы жніўні с. г. Віленскі ваявода зацьвердзіў статут вышэй ўспамянёнага Т-ва. Гэты саюз тых „арганізацыяў“, душой якіх зьяўляецца Антон Луцкевіч, якога паплечнікамі выступаюць Янка Станкевіч і іншыя нямногія лікам асобы.

„Саха“ Як ведама, беларуская гаспадарчая часопісь „Саха“ ужо даўно перастала выходзіць. Цяпер вось, як даведываемся, выдавецтва гэтай часапісі мае быць узноўлена. Рэдактарам месячнай гаспадарчай часопісі „Саха“ мае быць д-р М. Ільляшэвіч, а галоўнае яе выдавецтва будзе пад кіраўніцтвам інж. С. Бусела.

Папулярныя навуковыя лекцыі у гуртку Б. Інст. Гасп. і Культ. у Будславе. Дня 7 жніўня ў Будславе прачытаў лекцыю В. Грышкевіч на тэму „залатая пара ў гісторыі Беларусі“. Дня 24 жніўня с. г. прачытаў лекцыю ў Будславе кооп. Э. Будзька на тэму „Разьвіцьцё коопэрацыі і яе здабыткі ў Краі і заграніцай“.

Гарадзіскі гурток І. Г. і К. Баранавіцкага пав. 16.VIII с. г. ладзіў спэктакль-вечарыну ў Мядзьведзічах. Ставілі „Жанімства па радзё“ Грынкевіча.

Пачатак заняткаў у Віленскай Беларускай Гімназіі і зьмена на стаковішчы дырэктара гімназіі. Пачаткі ў Віл. Бел. Гімназіі пачаліся нармальна з дня 4 г. м.

Дасюлешні дырэктар Віл. Бел. Гімназіі Астроўскі, прыняўшы на сябе дырэктарста вучыцельскай сэмінарыі імені Фр. Багушэвіча, ад дырэктярства гімназіі адмовіўся. На дырэктара Віл. Бел. Гімназіі Кураторыя Віл. Школьнага вокругу зацьвердзіла грам. Міхалевіча.

Пры перадачы дырэктарства гімназіі, на паседжаньні Пэдагагічнай рады уступаю-

Гаспадарчы крызыс у Польшчы.

Праўду кажучы, цяпер перажывае гаспадарчы крызыс не адна Польшча, а нават амаль ня ўвесь сьвет. Але прычыны гаспадарчага крызысу эўрапэйскіх дзяржаў і Амэрыкі ад такога-ж крызысу ў Польшчы вельмі розьняцца.

Прычынай гаспадарчага крызысу ў Амэрыцы і ў дзяржавах Эўропы (апрача Польшчы) зьяўляецца надпрадукцыя, г. зн. вытворчасьць прадукцыі большая ад консумцыі, выразьней — тыя краі вытвараюць прадуктаў больш, як іх могуць спажыць. Дзеля таго кожная такая дзяржава мае прадукты на продаж, а купляць няма каму. Канада прадукуе збожа столькі, што пры найбольшай консумцыі ўвутры, мусіць яго прадаваць. Нямеччына, маючы моцна разбудаваны промысл, вытварае столькі тавараў, што ня можа іх сконсумаваць. Данія разьвіла гадоўлю быдла да тае ступені, што ніяк ня зможа зьесьці свайго масла і мусіць яго прадаваць заграніцу. У краёх гэтых прычынай гаспадарчага крызысу зьяўляецца н а д п р а д у к ц ы я.

Зусім справа інакш стаіць з гаспадарчым крызысам у Польшчы, які ўжо вельмі моцна гне ў дугу ня толькі Польшчу, але і так абяднеўшае беларускае сялянства Зах. Беларусі.

У польшчы няма надпрадукцыі. У Польшчы галоўнай прычынай гаспадарчага крызысу зьяўляецца абядненьне насельніцтва, якое з прычыны ўбожства ня можа быць адпаведным спажыўцом сваей прадукцыі.

Паводле слоў бышага марш. польскага сойму, Ратая, Польшча мае толькі адну пятую часьць з усяго насельніцтва „сытых“, каторыя аджыўляюцца так, як вымагае аджыўляцца кожнаму чалавеку мэдыцына. Рэшта, чатыры часьці насельніцтва Польшчы спажывае ежу такую, якою, праўда, напіхае жываты поўна і ўспакайвае голад, але гэтая ежа не дае ўсіх складнікаў патрэбных для арганізму працоўнага чалавека.

Факту гэткага палажэньня ў нас далёка шукаць ня трэба; даволі ўзглянуць на штодзеннае жыцьцё беларускага сялянства, якога ў межах Польскай дзяржавы налічваецца каля двух мільёнаў. Прычына абядненьня і нашага сялянства не ляжыць беспасрэдна ў беларускай вёсцы, а яна знаходзіцца ў апараце гаспадарчым Польскай дзяржавы, бо гаспадарча наш край, трэба сказаць, усёж-такі цяпер моцна зьвязаны з гаспадарчасьцяй Польшчы.

У параўнаньні з жыхарамі Амэрыкі і грамадзянамі дзяржаваў Зах. Эўропы аджыўляецца наш народ вельмі ўбога.

Да сусьветнай вайны падтрымлівала ў аджыўленьні нашае сялянства малако. Цяпер з прычыны гаспадарчага крызысу, які абясцэніў земляробскую прадукцыю, наш селянін пачаў не даядаць яшчэ больш. Прычын на гэта вельмі многа: падаткі, вельмі высокія цэны тавараў фабрычнага вырабу, без якіх селянін абыйсьціся ня можа, вымогі жыцьця вонкавай цывілізацыі — моднай вопраткі і інш. Дзеля таго, што прадукт малочнага тлушчу — масла крыху больш цэнны ад іншых земляробскіх прадуктаў, наш селянін пачаў „адвыкаць“ ад спажываньня добрага з неаддзеленым тлушчам малака. Малочны тлушч прадае так-жа за бясцэн, а сам спажывае сыраватку, якою ў дзяржавах Зах. Эўропы кормяць сьвіней. Дык і нічога дзіўнага, што ў гэтакіх варунках жыцьця пачынаюць сяляне хварэць на ўсялякія хранічныя хваробы, як сухоты і інш.

Каб у Польскай дзяржаве ўся люднасьць магла аджыўляцца так, як аджыўляецца люднасьць Амэрыкі і дзяржаваў Зах. Эўропы, дык прадукцыя земляробскай вытворчасьці Польскай дзяржавы мелабы пакульшто забяспечаны збыт у сябе на мейсцы і ня трэба было-б шукаць рынку збыту заграніцай.

Цяперашняя „надпрадукцыя“ у Польшчы ня ёсьць н а д п р а д у к ц ы я й вытворчасьці, а нядзольнасьць насельніцтва з прычыны яго ўбожства да адпаведнай консумцыі.

Земляроб, недаядаючы сам з сваей сямёю, мусіць прадаваць свае прадукты на неабходныя патрэбы ў гаспадарцы і падаткі, а бедная люднасьць местаў, ня маючы заработкаў з прычыны беспрабоцьця, заціскае жываты ў дзягу, ня могучы купляць у адпаведнай колькасьці і якасьці гэтых прадуктаў. Словам, галодны консумэнт, галодны і вытворца. На гэтую недаедзеную „надпрадукцыю“ польскі гандаль шукае рынку збыту заграніцай, дзе „сыты“ прадуцэнт і консумэнт. Рэч зразумелая, што заграніцай, пры такой кон'юнктуры, прадукцыя вывезеная з Польшчы аддаецца за бясцэн.

З гэтай прычыны і таннасьць земляробскай прадукцыі ў нас.

П—к.

чы дыр. Астроўскі сказаў разьвітальную прамову вітаючы новага дырэктара гімназіі Міхалевіча. Дырэктар Міхалевіч так-жа прыймаючы гэтае становішча ў прамове да Пэдагагічнай Рады, падкрэсьліў важнасьць працы на сваім становішчы.

З Радавай Беларусі.

„Няхай жыве вольны Беларускі народ“. Гэты кліч, у прысутнасьці сваіх катаў, быў апошнім словам растрэляненага ў Полацку арганізатара беларускага паўстаньня ў Радавай Беларусі Піліпа Лаўрыновіча.

Амэрыканская украінская газэта „Україна“ падае вось такую вестку:

„Беларуская газэта „Зьвязда“ з Менску, сталіцы Беларусі, паведамляе, што акружны суд (бальшавіцкі) у Полацку засудзіў на кару сьмерці беларускага арганізатара паўстаньня Піліпа Лаўрыновіча, беларуса, з вёскі Машыркі, Дзісненскага пав. Найвышэйшы суд прысуд зацьвердзіў і Лаўрыновіча растралялі. Ідучы на сьмерць, Лаўрыновіч крычаў: — Прэч з комунізмам! Няхай жыве вольны Беларускі народ!“

Няхай гэтая не адзіная і ня першая ахвяра за волю Беларускага народу будзе ацьвярэжаючым лекам на абдурманеныя галовы „вызваленцаў беларускіх працоўных мас з пад уплываў беларускага нацыянал-дэмократызму“, а голас мучаніка за волю свайго народу, праконываючым і „нашых“ гарлапанаў аб „свабодзе беларускіх працоўных масаў“ пад панаваньнем камунізму.

Арышты пасьля разьвязаньня Сойму і Сэнату.

Зараз-жа пасьля разьвязаньня Сойму і Сэнату пачаліся арышты б. сэнатараў і паслоў.

Дня 30.VIII с. г. арыштаваны і пасаджаны ў вастрог б. сэнатар, сябра Беларускага Пасольскага Клюбу **Базыль Рагуля.**

Б. сэнатар Рагуля ў часе выбараў у 1928 г. засуджаны акружным судом на 2 гады катаргі. На гэты прысуд Рагуля падаў апэляцыю, але апэляцыйны Суд справы разгледзіць тады ня ўсьпеў, бо пасьля выбараў, Сэнат пастанавіў судовую справу Рагулі ўстрымаць і зажадаў Рагулю звольніць з вастрогу.

У той самы дзень арыштаваны так-жа і б. паслы сябры „Беларускага“ Сял.-Работніцкага Пасольскага Клюбу „Змаганьня“ — Крынчык, Валынец і Гаўрылік.

Арышт пасла Дварчаніна. Па загаду пракурора пры акружным судзе ў Горадні, дня 19 VIII с. г. арыштаваны пас. Дварчанін і пасаджаны ў вастрог у Горадні. Прычына арышту, як падае польская прэса, вось такая:

Дня 19 жніўня ў Алекшыцах, Гарадзенскага пав. адбываўся гадавы фэст. На гэты фэст і ў гэтым годзе, як і ў гады папярэднія сабралася на набажэнства людзей вельмі многа. На гэты фэст у Алекшыцы прыбылі Дварчанін і Валынец. Пасьля набажэнства Дварчанін з Валынцом хацелі наладзіць мітынг. Паліцыя забараняючы мітынг пачала разганяць натоўп людзей. Дварчанін быццам пачаў страляць з рэвольвэра, а з натоўпу пасыпаліся каменьні ў паліцыю. У выніку гэтай суматохі аказаліся раненыя два паліцыянты. Паліцыя пачала страляць у гару. Дварчанін з Валынцом, убачыўшы непераліў, селі ў адяжджаючы з Алекшыц аўтобус і пачалі ўцякаць. Паліцыя аб гэтым усім праз тэлефон паведаміла пракуратару ў Горадні, якая і загадала арышт. Дварчаніна арыштавалі ў аўтабусе ў м. Індуры. У Алекшыцах арыштавана каля 10 асоб тамашніх жыхароў.

Пажары ў Галіччыне.

У апошнія часы на тэрыторыі Зах. Украіны няма тае ночы, каб ня здарыўся ў двух, трох і больш мясцох пажар. Гараць фальваркі і асады, а найбольш стагі збожжа і пошару. Пажары здараюцца пераважна ў фальварках польскіх паноў і асадах вайсковых асаднікаў. Польскія газэты падаюць, што пажары гэтыя, гэта быццам тэрор з боку нелегальнай украінскай вайсковай арганізацыі (УВО), якая паліць польскія фальваркі і іх збожжа. Польскія сфэры ў Галіччыне гэтым зьвішчам моцна затрывожаны. Тамашнія палякі пачалі арганізавацца ў арганізацыю самаабароны і заклікаюць урад прыняць рашучыя меры дзеля спыненьня пажараў. Урад гэтыя рашучыя меры тасуе, але пажары ня спыняюцца.

У выніку ўрадавых рашучасьцяў ёсьць многа арыштаваных, западазроных у падпаліваньні.

З украінскага жыцьця на эміграцыі.

Палажэньне Украінскага народу на бацькаўшчыне нічым ня рожніцца ад палажэньня народу Беларускага. Цяжкое палажэньне ў краю змусіла украінцаў найболып выэміграваць на чужыну. Украінцаў найбольш выэміґравала ў Амэрыку. Украінскія эміграванты, прабываючы на чужыне, вельмі добра сарганізаваны. Найлепш-жа украінскія эміґранты сарганізаваны ў Канадзе. Там яны нават маюць і свайго прадстаўніка-пасла ў тамашнім сойме. У апошнія часы эўрапэйская прэса падала, што украінцы ў Канадзе маюць 30 тысяч зарганізаванага войска і гэту вайсковую армію маюць павяліччыць да 80 тысяч Гэта украінскае войска ўзброена нават і ваеннымі аэрапланамі.

У Зл. Штатах Амэрыкі ў Шыкаго украінскія эміґранты выдаюць сваю газэту пад загалоўкам „Україна“. Газэта гэта мае кірунак незалежніцкі. Газэта „Україна“ ня мала месца пасьвячае і справам беларускім і літоўскім. Словам, палітычны кірунак гэтай газэты — добрасуседзкае сужыцьцё народаў: Украінскага, Беларускага і Літоўскага.

З Польшчы.

Зьмена ўраду, разьвязаньне Сойму і Сэнату і новыя выбары. У канцы жніўня с. г. у польскай унутранай палітыцы дайшло вось да такіх зьменаў:

Урад палкоўніка Слаўка 23.VIII падаўся ў адстаўку.

Дня 25.VIII Прэзыдэнт назначыў на прэм'ера міністраў Марш. Язэпа Пілсудзкага. Маршалак Пілсудзкі ўтварыў новы ўрад з тых самых міністраў, якія былі ў папярэднім урадзе палк. Слаўка. Марш. Пілсудзкі, стаўшы афіцыяльна на чале ўраду як прэм'ер яго, ніякіх зьменаў у ўрадзе не зрабіў апрача назначэньня на міністра бяз тэкі падпалкоўніка Бэка.

Пасьля ўтварэньня новага ўраду, Пілсудзкі, ужо як прэм'ер ураду, падыктаваў у газэты стацьцю, у якой у „свойскі“ спосаб выявіў яшчэ раз свой погляд на паслоў, якія не пашлі за Пілсудзкім, а так-жа на Сойм і Конституцыю. Сучасная конституцыя, казаў Пілсудзкі — няўхлюдая і сьмярдзіць пасольскім хлявом. Пілсудзкі конституцыю назваў „конститута“, а гэнае слова, казаў Пілсудзкі, — найбліжэйшае ёсьць да „проститута“. Сыстэма нахіляньня конституцыі да рожных патрэб заявіў Пілсудзкі,— робіць з конституцыі звычайную дзеўку...

Дня 29.VIII. Прэзыдэнт на прапазыцыю ўраду разьвязаў Сой і Сэнат, вызначаючы выбары ў Сойм на дзень 16 лістапада, а выбары ў Сэнат на дзень 23 лістапада 1930 г.

З заграніцы.

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў у Жэневе. Па прыкладу мінулых гадоў адбыўся і сёлета ад 3 да 6 г. м. Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў. У сёлетнім Кангрэсе Н. М. беларусы ўдзелу прыняць не магді з прычыны палітычнай сытуацыі ў Краю. Дзеля гэтага ад імя беларусаў Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні выслаў у Жэнэву тэлеграму, вітаючы Кангрэс Нац. Менш.

Ліга Народаў. У гэтым м-цы пачынаецца васеньняя сэсія Лігі Народаў. Гэта сэсія хіба што будзе першай сэсіяй Лігі, на якой пачнецца заглядываньня ў тыя шчылінкі, праз якія можна было-б вылезьці з вузлоў усялякага роду мірных дагавораў, каб можна было стварыць „Пан Эўропу“. Ня трэба сумнявацца, што Нямеччына патурзае крыху і за цяжкі вузел Вэрсальскага трактату, які так моцна яе зьвязаў.

Нямеччына. У апошнія часы Нямеччына моцна пачала дамагацца перагляду нямецка-польскай граніцы, а гэта дзеля таго, каб адабраць ад Польшчы Горны Шлёнск і Памор'е. Нямецкі міністр Трэвіранус сваімі прамовамі аб гэтай патрэбе для Нямеччыны нарабіў шуму ня толькі ў Польшчы, але і ў ва ўсей Эўропе. Нямецкі народ гэтай думкай таксама моцна праняўся. У цяперашнія выбары ў Сойм, якія адбудуцца 14 г. м. некаторыя партыі ідуць на выбары з клічам аб патрэбе перагляду нямецка-польскай граніцы.

Да нас пішуць.

ТРУДНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

В Быхаўшчына, Нясьвіскага пав. У нашых ваколіцах густой масай людзкой жывуць беларусы—хлебаробы. Працуюць нашы людцы над чорным куском хлеба, б'юцца, як рыба аб лёд, а дабра як няма так няма. Год ад году ўсё бяднеюць і бяднеюць. Зямлі мала, грошай сусім няма, а лік насельніцтва пабольшываецца. Варштат працы для вольных рук ня толькі не павялічваецца, але яшчэ зьмяншаецца. Хіба хутка прыдзе час, што прыдзецца многім „сьвяткаваць“ штодня. Цяпер ужо даходзіць да таго, што калі ня хочаш „сьвяткаваць“, дык працуй дарма, бо адзіны заработак нашых людзей гэта ў двары польскага пана, а ў гэтым двары пан больш плаціць, як 1 злот у дзень за працу, ня хоча.

Гэта з боку матэр'яльнага. Нялепш, калі яшчэ і ня горш жывецца, тутэйшаму беларускаму сялянству і ў галіне жыцьця духовага.

Дзяцей мусяць пасылаць у школу польскую, бо беларускай няма, а дастаць яе ня лёгка. Мусіць лягчэй былоб сонца сьцягнуць з неба і пасадзіць на комін сялянскай хаты, чымсь у нашай вёсцы адкрыць родную беларускую школу.

Прыдзе сьвята або нядзеля, душа цягне да нечага вышэйшага, каб адарваца хоць на хвіліну ад жыцьця матэр'яльнага— ідуць сяляне ў царкву. Але і там ўсё чужое і незразумелае, толькі мучыць душу, а не ўспакайвае яе. Глядзіш на гэтае блудпае жыцьцё і гледзячы душа баліць. Адну адзіную духовую пацеху прыносіць нашым людзям дык гэта толькі родная беларуская газэта.

Дзе знайсьці спачуцьцё і пацеху мае наш гаротны беларускі селянін? Няўжож у ненавісьці да ўсяго, што ёсьць жыцьцём і сапраўднай пацехай — у комунізме? Не, там яе ня знайдзе! А туды нашае сялянства адны пхаюць, а другія цягнуць. Дзіўны сулад між гэтымі дзьвямя сіламі, якія адна другой так варожыя, а ў адносінах да нашага сялянства так суладныя. Адны ў камуну цягнуць, а другія падпіхаюць. Што павінен у такіх абставінах рабіць наш народ?

Народ наш павінен бараніць свой быт. Трэба змагацца з аднымі і другімі, дамагаючыся ўсюды належных сабе правоў.

Зязюля.

ВЕЧАР БАГУШЭВІЧА.

Будслаў, Вялейскага пав. У нядзелю 10.VIII-30 г. Будслаўскі Гуртох Б. І. Г. і К. зладзіў у м. Будславе ўрачыстую акадэмію 30-х угодкаў сьмерці Фр. Багушэвіча. Праграма акадэміі была досыць багатая. Уступнае слова сказаў старшыня гуртка Ч. Ханяка. Грам. А. Война прачытаў рэфэрат аб жыцьці і творчасьці паэта. Чарговым пунктам праграмы было адыграньне абразку Купалы „На папасе“ і дэклемацыя вершаў Багушэвіча. Закончыў урачыстасьць хор, які, пад кіраўніцтвам грам. М. Чантарыцкага, выканаў пару песьняў, з захапленьнем спатканых праз слухачоў. Пры гэтым трэба падкрэсьліць заслугу Будслаўскага Гуртка Б. І.

Г. і К., які, жадаючы даць доступ на акадэмію ўсім, зрабіў уступ безплатны.

Прысутны.

ХТО СЕЕ ВЕЦЕР, ПАЖЫНАЕ БУРУ.

Мядзьведзічы, Баранавіцкага пав. Аб тым, што ў нашым краю існуе вялікі падзел на дзьве клясы — паны абшарнікі і беларускае сялянства, ніхто запярэчыць ня можа. Гэтыя клясы маюць між сабой падзел і нацыянальны. Паны абшарнікі палякі або расейцы, а сяляне беларусы. Сялян многа, а абшарнікаў мала. Абшарнікі багатыя, а сяляне бедната. Вось гэтыя дзьве клясы нашага краю ніяк ня маюць дайсьці да поўнага суладу. Адны другіх ненавідзяць і адны другіх прасьледуюць. Ведамая рэч, што гэткі стан ёсьць ненармальны і ў жыцьці ён павінен быць зьліквідаваны. Аб спосабах ліквідацыі гэтай ненармальнасьці ўжо ня раз і ня два пісалася ў беларускіх газэтах і гаварылася на беларускіх зьездах. Але вось дзіўнае зьявішча, што паны абшарнікі ня то што ня йдуць на спатканьне ліквідацыі гэтай клясовай ненавісьці, а яе яшчэ больш паглыбляюць нават безкарысна для сябе. Дзіўная тактыка сужыцьця пана абшарніка з сялянствам.

Возьмем вось такі прыклад. Каля нас адзін пан абшарнік аддаў у арэнду сялянам выган. Калі сяляне пачалі пасьвіць на выгане сваю жывёлу, абшарнік выган разгарадзіў і ў адгароджаную часьць ня пускае сялян.

На што такія падходы, такое завастрэньне? Ці ня лепш было ўперад разгранічыць выган і сялянам сказаць, што за гэтую цану аддае вось толькі такую часьць: Або нават такія штучкі: — за сабраныя ў панскім лесе ягады або грыбы дворныя адміністратары вымагаюць ад гэтых „зладзеяў“ ягадаў і грыбоў па 5 зл. кары.

Гэтаж і ёсьць паступкі, якія паглыбляюць ненавісьць клясовую. А хто сее вецер, пажынае буру. Б. С.

ТРЭБА ЗА СВАЁ СТАЯЦЬ І НАД САБОЙ ПРАЦАВАЦЬ.

Крывічы, Вялейскага пав. Наша родная газэта „Б. Крыніца“ прыходзіць да нас. Людзі яе, як дастануць дык ахвотна чытаюць. Адна бяда, што наша газэта „Б. Кр.“ мае цяжкія этапныя пункты ў сваей падарожы. Найцяжэйшы пункт падарожы для „Б. Крыніцы“ дык гэта наша гміна. Адтуль ёй выбрацца ў вёску трудна. Калі і далей будуць зьдзекавацца ў гміне над нашай роднай газэтай, прыдзецца шукаць справядлівасьці ў адносных уладаў.

Другой бядой зьяўляецца ў нашых ваколіцах нядбайнасьць моладзі ў працы над сабой. Моладзь наша больш ні аб чым ня турбуецца апрача піцьця гарэлкі. Віпіўшы гарэлкі мерае свае сілы ў бойках.

Дарагая моладзь, дасюлешнія Вашыя паступкі стыдныя і шкодныя. Бярэце прыклад з моладзі суседняй Будслаўскай гміны. Зарганізуйце гуртох Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры і працуйце над сабой дзеля свайго ўласнага і ўсяго нашага беларускага народу дабра. Крывіцкі.

НЯ РОЎНАЕ ЗМАГАНЬНЕ.

Браслаўскі пав. Апошнімі часамі польскія шовіністы так узварушыліся ў Браслаўшчыне, што беларускія сяляне і зраўняцца з імі ня змогуць. Галоўныя стаўпы польскасьці ў Браслаўскім павеце, гэта п. Стараста і кс. дзекан Мёрскі. Першага вучыць ня трэба, мусіць сам ведае як і што рабіць, а другога дык пад'яжджаюць настаўлянь.

Прад выбарамі ў Мёры кс. дзекан быў склікаўшы ўсіх ваколічных польскіх ксяндзоў на нейкую нараду, але паказаць пуцявіну іхняй „працы“ прыяжджаў сам рэдактар эндэцкіх газэт п. Каўнацкі.

Ня даўна зьявіўся ў Браслаўшчыну па прыкладу мінулага году „будаўнічы“ танных касьцёлаў, але там дзе ня трэба — кс. Бародзіч. Прыехаў ён на ўласным аўтамабілі, які варт 15 тысяч зл. Прывёў ён з сабой і сваю... кухарку. Гэты пан ксёндз увіваючыся па Браслаўшчыне на аўтамабілю арганізаваў нейкія польскія камітэты з шляхтоў і асаднікаў польскіх.

Дык вось якая праца польскасьці ў Браслаўскім павеце. Бародзіч з аўтамабілем, ксяндзы эндэкі з павагай духоўнага стану, урадоўцы з „аўторытэтам“ улады, а шляхтувы з асаднікамі з шырэйшай нівай зямлі.

Беларуская праца праводзіцца ў Браслаўшчыне вось так: Газэты беларускай у пару не атрымаеш, бо яна мусіць „пагасьціць“ на пошце, пасьля пацёрціся ў кішані солтыса, або „пастыдацца“ лежачы ў куце ў гміне, пазіраючы на дзьверы і чакаючы адпаведнай хвіліны, каб уцячы адтуль у вёску да свайго чытача, калі ў гэтай дарозе вытрымае і ня згіне, дык беларускі селянін прачытае яе, а то так ня чытаная і сваё існаваньне закончыць. Каліж газэта „перагрывае“ сваю цяжкую падарожу і дастаецца свайму чытачу ў рукі, тады ўжо чытач, стыдаецца“ з за яе; ад войта, паліцэйскага і польскага вучыцеля, бо яны на чытача „вандроўніць“ беларускай газэты пазіраюць нейк скоса.

Хочучы залажыць беларускую арганізацыю, дык трэба пісаць паданьні, пасьля легалізаваць яе, залегалізаваўшы прасіць дазволаў на ўсялякія зборкі, лекцыі, прадстаўленьні і інш. Атрымаўшы дазвол сціслa трымайся праграмы дазволу, бо калі чуць ухібнуў, паліцыянт кажа: стой машына.

Гэтыя легалізацыі і дазволы ў урадавых інстытуцыях так абстаўлены параграфамі і артыкуламі, што трэба добра пахадзіць, каб дастаць. А гэтаж усё мусіць наш селянін „абцягаць“ пехатой, бо езьдзіць няма за што. Аўтамабіляў у беларусаў няма і па тэлефону гэтакай справы не залатвіш.

Дык вось якая роўнасьць працы беларускай з працай польскай. Але ўсёж такі беларускасьць польшчыне ў Браслаўскім павеце не паддаецца. І мусіць вудна стане польскім паном пакуль яны перамогуць беларускіх сялян. Беларус жыў, жыве і жыць будзе. Павяцкі.

Парада ў справе беларускай школы.

ПЫТАНЬНЕ. Жыхары нашай вёскі В— Бухаўшчына, Нясьвіскага пав. у мінулым 1929 годзе падалі школьнаму Інспэктару ў Нясьвіжы 29 дэклярацыяў на 41 дзяцей вучняў з просьбай ператтварыць школу польскую на беларускую ў нашым школьным абводзе. Нясьвіскі Школьны Інспэктар у канцы м-ца траўня с. г. гэтыя дэклярацыі правяраў на мейсцы ў вёсцы. Які быў вынік пацьверджаньня дэклярацыяў Інспэктарам мы ня ведаем. Цяпер, 20 ліпня с. г. атрымалі мы паведамленьне з Куратoрыі, што ў нашай вёсцы школы беларускай ня будзе, а астаецца па старому школа польская. У паведамленьні гэтым польскія школьныя ўлады матывуюць свой адказ процір беларускай школы ў нас тым, што быццам беларускай школы прошана ў дэклярацыях толькі для 32 дзяцей. (Цікава, дзе дзелася рэшта — дзяцей)? У гэтым паведамленьні сказана, што адмову адкрыць беларускую школу школьных уладаў можна ў працягу 14 дзён заскаржыць у Міністэрства Асьветы ў Варшаве. Мы ведаючы, што і ў Міністэрстве такія-ж самыя польскія ўрадоўцы, якія ў Куратoрыі і Інспэктарацe, нічога ўжо больш не рабілі. Дык як нам паступіць, каб усёж такі здабыць родную школу?

АДКАЗ. У Міністэрства падаць скаргу трэба было, але як прапусьцілі тэрмін, дык няма што і думаць.

Даведайцеся, на чые дзеці ўлады школьныя прызналі Вашыя дэклярацыі важныя, а лік дзяцей прызнаных за беларускія 32, дык Вы ў гэтым годзе падайце дэклярацыі на некалькі дзяцей, каб з тымі 32 было крыху больш 40 і прасіце далучыць новападаныя дэклярацыі да дэклярацыяў тых, што на 32 дзяцей. Так-жа і бацькі тых 32 „шчасьлівых“ дзяцей няхай пададуць супольна паданьне Інспэктару аб тым, што яны не зракліся сваіх дэклярацыяў і хочуць школы беларускай. Гэткім парадкам узновіце справу нанова.

Наша пошта.

Я. Гарустовічу. Грошы ад Вас атрыманы, газэта пасылаецца.

Кільчэўскаму. Вашу справу перадалі ў Бел. Пас. Клюб.

О. Алесю. З матар'ялаў скарыстаем.

Я. Кузьмінаву. Газэту пасылаем, прысылайце падпісную плату.

М. Казакевічу. Грошы атрымалі, дзякуем, газэту пасылаем.

М. Мніху ў Амэрыцы. Просьбу Вашу спаўняем.

Я. М. (дохтару). Просьбу Вашу споўнілі, як самі бачыце.

П. Інф. Прасова. Ня ведаем, чаму Вы не атрымліваеце нашу часопісь, бо высылаецца акуратна.

Я. Госка. Газэту пасылаем, прысылайце падпіску.

І. Мартышэнка. З прысланага скарыстаем.

Студэнту. За матэр'ялы шчыра дзякуем, скарыстаем. Пішыце больш.

Мёрскім падпішчыкам. Вашу скаргу скіравалі да Дырэкцыі Паштовай. З недаручэньнем газэт толькі так і трэба змагацца.

Славяніну. Газэту высылаць будзем, чакаем грошай за газэту. Газэту пасылаем дарма толькі супрацоўнікам, каторыя падаюць нашай рэдакцыі весткі ў газэту.

Крывіцкаму. Дзякуем, карыстаем, пішыце больш, што ў Вас чуваць.

Газэту будзем высылаць. Славянскаму, Шаняку, Буйневічу, Лэшуку і Кузьмічу, чакаем за газэту грошай.

К. Яковічу. Трэбуйце на пошце карты прэнумэраты, там Вы упісаны. Добра робіце, што змагаецеся з нішчэньнем на пошце нашай газэты.

Амільянчыку. Газэту пасылаем толькі за грошы і дарма сваім супрацоўнікам. Калі вы сапраўды хрысьціянін, дык на Вашае пісьмо даём вось такі адказ: — „Калі табе здаецца, што многа ведаеш і даволі добра разумееш, знай тады, што шмат больш таго, чаго ты ня ведаеш“. І гэтыя словы добра ўдумайцеся і знайдзеце адказ на сваё пісьмо да нас.

Стрэльчыку. Атрымалі, карыстаем, пішыце больш.

Вількойцю. Вельмі добра робіце, што спісываеце народныя песьні. Сьпісаўшы прысылайце, будуць некалі выдрукаваны. З нотамі трудна, дык хоць бяз нот. Сякерку захавайце, пры зручнасьці перадасьцё ў музэй.

Мартышэнку. Газэту высылаць будзем, за прысланае дзякуем, карыстаем, адказ даём.

Ярмалковічу. Дзякуем, скарыстаем.

Жылку. На жаль зьмясьціць Вашай карэспандэнцыі ня можам, яна ня мае характару ані народнага ані грамадзкага, а толькі асабісты. Пішыце аб справах больш паважнейшых, друкаваць будзем.

Сухадольскаму. За народныя песьні дзякуем, некалі-ж выдрукуюцца.

Рудко. У сэмінарыю паступіць і пры ёй здаваць экзамен Вам трудна, бо яна толькі пачынаецца. Вы добра падгатуйцеся і папрабуйце здаваць экзамен на лета прад камісіяй Куратoрыі. Просьбу Вашу споўнілі.

Александровічу. 3 зл. атрымалі. Газэту высылаем з 1.IX.

Анкудовічу. 84 зл. атрымалі, дзякуем.

На газэту грошы атрымалі ад: М. Пасюты 6 зл., Б. Хвешчэвік 2 зл. 50 гр., Н. Кісель 1 зл. 50 гр., А. Сінкевіча 2 зл. і Р. Вэнцковіча 4 зл. — дзякуем, газэту пасылаем.

Выпісвайце Каталёг
беларускай кнігарні „Пагоня“, які высылаецца бясплатна.
Беларуская Кнігарня „Пагоня“
Вільня, Людвісарская вул. 1.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч